# РЫТУАЛЬНЫЯ ВОБРАЗЫ ГОЛУБА І ГАЛУБКІ Ў ВЯСЕЛЬНЫХ ПЕСНЯХ БЕЛАРУСАЎ





**Алена Паўлава,**
навуковы супрацоўнік
аддзела фалькларыстыкі
і культуры славянскіх народаў
Цэнтру даследаванняў
беларускай культуры,
мовы і літаратуры НАН Беларусі

Голуб і галубка адносяцца да ліку арніталагічных вобразаў-сімвалаў, якія найчасцей ужываюцца ў вясельных песнях беларусаў. Ва ўяўленнях усходнеславянскіх народаў, у тым ліку беларускага, голуб заўсёды лічыўся птушкай святой, чыстай, «божай», як і бусел, жаўранак ці салавей. Паводле меркаванняў А.В. Гуры, «голуб як птушка «чыстая» проціпастаўляецца птушкам «нячыстым», драпежным» [16]. У тэкстах вясельных песень на кожным з этапаў шлюбнага абраду гэтыя арніталагічныя вобразы сімвалізуюць каханне, атаясамліваюцца з персанажнымі вобразамі: галоўнымі дзеючымі асобамі вясельнай урачыстасці – жаніхом і нявестай, а таксама сватамі, бацькамі маладых, свашкамі, дружкамі…

Засяродзім увагу на характарыстыцы вобразаў голуба і галубкі як увасабленні закаханых маладых на кожным абрадавым этапе вяселля. На самым першым з іх, давясельным, галоўная гераіня – дзяўчына, якая яшчэ не мае статусу маладой. Ёй сніцца сон, дзе галубы сімвалізуюць сватоў, тым самым прадракаючы хуткую змену ў жыцці [5]:

*Ой, мамачка родная,*
*Разгадай мой дзіўны сон:*
*Галубы наляцелі,*
*На варотах паселі.*
*На варотах паселі*
*І жоўты шоўк развесілі.*
*Жоўты шоўк развесілі,*
*Золатам абсыпалі.*
*– Галубы – сваты твае,*
*Жоўты шоўк – дарогі твае,*
*Золата – слёзкі твае.*

У тэкстах вясельных песень, якія суправаджалі сватанне, гучалі матывы ўзвышэння прыгажосці дзяўчыны-нявесты, а таксама ўзвялічвання пачуцця яе годнасці (белая, румяная, стройная, прывабная). Нездарма маладую параўноўвалі з лагоднай птушкай – шызакрылай галубкай, добрай парай стройнаму і прыгожаму малайцу, вобразам-сімвалам якога з'яўляецца голуб [7]:

*Ай, хіцёр-мудзёр Яначка,*
*З-пад лесу ўзыйшоў хмаркаю,*
*Поле перайшоў дожджыкам*
*Пад двор падыйшоў ракою,*
*У вароціках стаў вярбою,*
*У сені ўляцеў галубком,*
*У хату ўвайшоў малайцом,*
*За столікам сеў панічом.*
*– Хадзі, мая дзеванька, сядзь ля мяне.*
*– Пачакай, Яначка, прыбяруся,*
*Па пояс золатам абаўюся,*
*А па плечанькі серабром.*
*Выпушчу касу к паясу,*
*Няхай мая косанька алее,*
*Няхай мая радзіна жалее.*
*Алее косанька да цвету,*
*Жалее радзіна да веку.*

Даволі часта падчас сватання прыгожая цнатлівая дзяўчына атаясамліваецца з арніталагічным вобразам-сімвалам галубкі [7]:

*Прыехалі мы на мяцёны двор,*
*Вынесіце нам цясовы стол,*
*Вып'ем да па кубачку,*
*Прыехалі мы па галубачку.*
*Па галубачку да па сіваньку,*
*Па дзевачку да маладзеньку,*
*Дай, божа, маладым добрую долю!*

Сярод песень давясельнага перыяду вылучаюцца тэксты, цэнтральным матывам якіх з'яўляецца зварот жаніха да бацькі з просьбай збірацца ў сваты. У дадзеным выпадку голуб выступае ў ролі **птушкі – прадвесніцы перамен** у жыцці маладога, які раіцца з бацькам наконт будучага вяселля [5]:

*Дай ў сенях галубок гудзе,*
*А на хату галасок ідзе,*
*Жанішок бацюхну*
*Да да ног падзе:*
*– Мой бацюхна родны,*
*Збірай маю радзінаньку,*
*Блізкую й далёкую,*
*Багатую й убогую.*

На давясельнай стадыі, а дакладней падчас абраду сватання, найчасцей голуб выступае ў якасці вобраза-сімвала **жаніха**, а галубка – **нявесты**. У вясельных песнях гэтага абрадавага этапу прасочваецца матыў своеасаблівага выбару – жаніх прыязджае па маладую, якая па падвор'ю ходзіць і хаваецца [6]:

*– Сівы-белы да галубаньку,*
*Ці быў жа ты на Дунаеньку,*
*Ці бачыў ты да галубаньку?*
*– Быў жа я ў сваёй цешчанькі,*
*Бачыў я сваю Мар'юхну.*
*Ходзіць яна па падвор'ю…*

З прыведзеных радкоў вынікае, што голуб з'яўляецца паэтычным вобразам **жаніха**, а галубка – **нявесты**. Праз вобразы гэтых птушак перададзены такія рысы нарачоных, як вернасць і адданасць у каханні, а таксама гучыць матыў неразлучнасці птушак як сімвал еднасці маладых, нездарма ў абрадзе па сённяшні дзень вобразы гэтых птушак можна сустрэць паўсюль (на каравai, калі выпускаюць галубоў, на ручніках…) [7]:

*Галубок з галубою*
*Селі сабе на дубочку,*
*Паціхоньку варкуюць:*
*– А мая ж ты галубка,*
*А мая дарагая,*
*Каб я тое ведаў,*
*Што ты мая будзеш –*
*Я б табе гарох насіў,*
*Я б табе сучавіцу,*
*З крыніцы вадзіцу.*
*Дзевачка з малойчыкам*
*Селі сабе за столікам,*
*Паціхоньку гавораць:*
*– А мая ж ты дзевачка,*
*А мая дарагая,*
*Каб я тое ведаў,*



*Што ты мая будзеш –*
*Я б табе дамы строіў,*
*Я б табе сады садзіў,*
*Я б табе сукні спраўляў,*
*Я б цябе карміў-паіў…*
*Называў міленькаю.*

З матывам неразлучнасці птушак звязана веліч кахання маладых: «Як ляціць сіз **голуб**, зямля дрыжыць, // Ён вязець **галубку** пад крылышкам. // Як едзіць **Лявон**, зямля дрыжыць, колакал звоніць, // Ён вядзець **Ганну** пад ручаньку» [6]. Пры дапамозе вобразна-псіхалагічнага паралелізму ілюструецца непадзельнасць дзвюх пар закаханых: арніталагічных вобразаў (голуб, галубка) і персанажных (жаніх, нявеста).

У корпусе песень, прымеркаваных да абрадавага этапу «Чаканне маладога», з вобразам галубкі звязаны матыў развітання з бацькоўскім домам, «русай касой». Звернемся непасрэдна да прыкладаў [6]. Матыў развітання з бацькоўскай хатай вельмі яскравы ў дадзеных творах [6]:

*Красна Алёнка сенечкі мяла,*
*Як галубачка гула.*
*А што сагнецца, што разагнецца,*
*Слезанькамі абальецца.*

Калі маладая чакае маладога, то найчасцей у тэкстах песень пераважае функцыя развітальная, дзе дзяўчына развітваецца са сваімі сяброўкамі. Тут можна ўбачыць своеасаблівы пераход ад дзевачкі-галубачкі да жанчыны, якой з сяброўкамі ўжо не пагуляці [6]:

*А лятали галубкі*
*Каля нізу ў лозанькі…*
*… Памаленьку, падружкі,*
*Не абатрыце серабра,*
*Не абламайце золата,*
*У мяне серабра таткіна,*
*У мяне золата мамкіна.*

Іншай з’яўляецца функцыянальнасць вобразаў голуба і галубкі на абрадавым этапе «Вясельны поезд маладога», дзе галубы выступаюць у ролі сватоў [7]:

*Наляцела галубоў полан двор.*
*– Пазнай, пазнай, галубушка, каторы твой.*
*Наехала баяраў полан двор.*
*– Пазнай, Аўдотка, каторы твой…*

Трэба адзначыць, што вясельна-абрадавы комплекс вылучае корпус песень, якія бытуюць на Палессі, дзе менавіта сваты выступаюць у вобразе галубоў.

Абрадавы этап «пасад» суправаджаўся песнямі, у якіх галубы выконвалі функцыю **вестуноў** [4]:

*У абрубленым да калодзезі,*
*Там дзевачка воду брала,*
*Ды на свой край паглядала.*
*Ажно ляцяць два галубочкі.*
*– Галубочкі вы сівенькія,*
*Заляціце на маю старонку,*
*Накажыце майму бацэньку,*
*Ці я сюды запрададзена,*
*Ці я сюды так аддадзена,*
*Як я сюды запрададзена,*
*То няхай адкупляюць,*
*Як я сюды так аддадзена,*
*То няхай адбіраюць.*

У кантэксце прыведзенай песні гучыць матыў звароту дзяўчыны да галубоў з просьбай паляцець на яе родную старонку да любага баценькі, каб ён забраў яе з чужыны дадому.

У іншых песенных прыкладах паведамляецца аб маці маладзіцы, якая перад тым, як развітацца па заканчэнні вяселля, звяртаецца да **свацці**, называючы яе ласкава «галубіцай», просіць часцей адпускаць дачку-ластаўку ў госці да бацькоў, паважаць маладзіцу, лічыць яе гаспадыняй у хаце [3]:

*Сваціца, галубіца, просім вас,*
*Пераляцела наша ластаўка да вас.*
*А вы ж ёй хоць піці, есці давайце,*
*Часцей яе к мамцы ў госцікі пушчайце.*
*Вы яе хоць трэсачкі насіць застаўляйце,*
*А ўсё ж гаспадынькай называйце.*

У вобразе голуба на этапе «Вяртанне маладых дадому» паўстае **жаніх-зяць**. Адразу гэтыя ролі прадвызначаюцца пры дапамозе галубоў [6].

На этапе яднання маладых мы можам убачыць **жаніха** ў выглядзе «перавознічка-галубка». Хлопец просіць голуба перавезці яго на той бок [5]. Трэба адзначыць, што дадзены прыклад сустракаецца даволі рэдка, таму можна лічыць яго адзінкавым.

І зноў жа на этапе яднання маладых «галубачкі» сімвалізуюць **сяброўак** [7], але ролі ў іх розныя. Функцыю з’яднання маладых дапаўняе функцыя змены статусу. У якасці адзінкавага прыкладу можна сустрэць тэкст песні, дзе жаніха з нявестай на гэтым жа этапе могуць сімвалізаваць голуб з галубкай [7]. Вялікую групу складаюць песні, дзе вобразамі-сімваламі членаў **дружыны** з’яўляюцца галубы, сярод якіх голуб-жаніх: «Наляцела ***галубоў*** полан двор. // – Пазнай, пазнай,

***галубушка***, каторы твой. // Наехала баяраў полан двор. // – Пазнай, Аўдотка, каторы твой. // – Проціў печы, лапленыя плечы – то не мой. / На прыпечку, са скрыпачкай – скамарошка. // На ўслончыку, у каворчыку – дзевер мой. // На куце, у золаце – свёкар мой. // На коніке, у чырвоніке – вот то мой» [7].

На этапе развітання маладой з домам галубы сімвалізуюць **гасцей**, а сярод іх знаходзяцца голуб – жаніх ды галубка – нявеста [8]. Развітальная функцыя перададзена праз вобраз **галубкі-маці** [8]. Матыў суму бацькоў у сувязі з развітаннем дачкі з роднай хатай перададзены праз вобраз-сімвал галубкі: «Где ж наша ***галубачка***, // Што з намі піла, ела, // Ад нас паляцела? // У Януська сады цвілі, // Там яна села і пала // Да і нам наказала, // Штоб мы прыехалі // Да яе адведалі» [9].

Трэба адзначыць, што арнітаморфны вобраз-сімвал галубкі, надзелены жаночай сімволікай, атаясамліваўся ў тэкстах народных песень вясельнага перыяду не толькі з вобразам дзяўчыны-нявесты, але таксама з вобразам яе **маці**: «Ох, ***мамка-галубка***, // Мяне муж не любя. // Мяне муж не любя, // К сабе не галубя…» [10]; сваццямі і сяброўкамі маладой [5]:

*– Свашачкі-галубочкі,*
*Мы з вамі да не біліся,*
*Мы з вамі да не сварыліся.*
*Свашачкі-галубочкі,*
*А мы з вамі да памірымся*
*Ды на шышачкі памяняемся.*
*– Дзевачкі-галубочкі,*
*Ды мы ж гэтага хацелі,*
*Штоб і з вамі памірыціся.*

Апрача таго, у некаторых песнях уласнавясельнага перыяду вобраз голуба сімвалізуе **роднага малодшага брата маладой**, а вобраз галубкі – яе **найменшую сястрыцу**, аб чым сведчыць фрагмент з развітальнай вясельнай песні, што выконвалася падчас ад'езду нявесты з роднай хаты [8]:

*…– Каб мая ж мама знала,*
*Мне б вячэру прыслала –*
*Сівенькім галубочкам*
*Тай найменшанькім браточкам.*
*Каб мая мама знала,*
*То б мне вячэру прыслала –*
*Сіваю галубкаю,*
*Найменшаю сястрыцаю.*

Між іншым галубка складае пару не толькі з голубам, але і з іншымі птушкамі, напрыклад з салаўём [10]:

*Да прыляцеў соловейко,*
*Сеў на лому.*
*Ой, скучненько мне самому.*
*Каб моя голубонька со мною,*
*Шчабятаў бы ўсю ночку я з ёю.*
*Да прыехаў Іваночку,*
*Сеў за столом.*
*Ой, скучненько мне самому.*
*Каб мая Насточка со мною,*
*Гаварыў бы ўсю ночку я з ёю.*

Як сведчыць фактычны матэрыял, вобразы галубоў могуць выступаць у функцыянальнай ролі маладога і маладой, сваццi, членаў вясельнай дружыны, дружак маладых, тым самым адметна раскрываючы і дапаўняючы дадзеныя вобразы.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Анталогія беларускай народнай песні і прыпеўкі / Уклад. і прадм. А.В. Цітаўца.– Мінск, 2001.
2. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т. 1. Акапэла – Куцця / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш.– Мінск, 2005.
3. Беларускі фальклор. Хрэстаматыя. Выд. 2-е, дап. Склад. К.П. Кабашнікаў, А.С. Ліс, А.С. Фядосік, І.К. Цішчанка.– Мінск, 1977.
4. Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / Уклад., сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступны артыкул, рэдагаванне – І.Ф. Штэйнер, В.С. Новак.– Мінск, 2003.
5. Вяселле. Песні ў 6 кн. Кн. 1 / [Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка; рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік].– Мінск, 1980.
6. Вяселле. Песні. У 6-ці кн. Кн. 3 / [Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка; рэд. М.Я. Грынблат, А.С. Фядосік].– Мінск, 1983.
7. Вяселле. Песні. У 6 кн. Кн. 4 / [Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка; рэд. А.С. Фядосік].– Мінск, 1985.
8. Вяселле. Песні. У 6 кн. Кн. 5 / [Склад. Л.А. Малаш; Муз. дадат. З.Я. Мажэйка; Рэд. А.С. Фядосік].– Мінск, 1986.
9. Вяселле. Песні. У 6 кн. Кн. 6 / [Склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка; рэд. А.С. Фядосік].– Мінск, 1988.
10. Вясельная традыцыя Гомельшчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік / Укладанне В.С. Новак; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны.– Мінск, 2011.
11. Гілевіч Н.С. Лірыка беларускага вяселля. / Уклад. і рэд. Н.С. Гілевіча.– Мінск, 1979.
12. Гілевіч Н.С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Слова і вобраз. Паэтычны сінтаксіс. Гукапіс і рыфма.– Мінск, 1975.
13. Голас з невычэрпнай і жыватворнай крыніцы / Склад. У.В. Анічэнка.– Мінск, 1995.
14. Машынскі К. Усходняе Палессе / Казімір Машынскі; уклад., прадм., камент. У. Васілевіча; пер. Л. Салавей.– Мінск, 2014.
15. Песні Беласточчыны / Уклад. Мікола Гайдук.– Мінск, 1997.
16. Славянские древности. Этнолингвистический словарь. В 5 т. Т. 1. А (Август) – Г (Гусь) / Под ред. Н.И. Толстого.– М., 1995.
17. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / НАН Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; уклад., сістэматызацыя тэкстаў і камент. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай; уступ. арт. Т.В. Валодзінай; навук. рэд. А.С. Ліс.– 2-е выд.– Мінск, 2005.